**С. Я. Новікаў**

# АБАРОНЧЫЯ БАІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ЛЕТАМ 1941 ГОДА Ў НАЙНОЎШЫХ БЕЛАРУСКІХ, РАСІЙСКІХ І ЎКРАІНСКІХ ДАСЛЕДАВАННЯХ: ПАРАЎНАЎЧЫ АНАЛІЗ

Напярэдадні 75-й гадавіны з пачатку абарончых баёў на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. гісторыка-дакументальнае выданне «1941 год. Страна в огне» (М., 2011, Кн. 1: Очерки; Кн. 2: Документы и материалы) не страчвае сваёй даследчыцкай актуальнасці, хоць да гэтай пары не атрымала істотнай увагі ў айчыннай ваенна-гістарычнай навуцы [1; 2; 3; 4; 5].

Прадметам нашага аналізу з'яўляецца навуковае адлюстраванне баявых дзеянняў Чырвонай арміі і германскага вермахта на тэрыторыі Беларусі, Расіі і Украіны летам 1941 г.

У першай кнізе змешчаны гістарычныя нарысы, падрыхтаваныя вядомымі беларускімі, расійскімі і ўкраінскімі гісторыкамі. Пачынаецца яна зваротам да чытачоў кіраўнікоў акадэмічных інстытутаў трох краін – А. А. Кавалені (Беларусь), В. А. Смолія (Украіна) і А. А. Чубар'яна (Расія), якія адзначаюць, што ў 1990–2000-я гг. на прасторах СНД «узніклі і развіваюцца нацыянальныя школы гісторыкаў са сваімі поглядамі і ацэнкамі» [6, с. 5].

У першай частцы «Расія» (с. 7–240) летнім падзеям прысвечаны матэрыял «На грані катастрофы. 22 чэрвеня – верасень 1941 года» (М. Ю. Мягкоў) (с. 78–192). Даследчык паказвае суадносіны сіл двух бакоў, прыводзячы вядомы з савецкай гістарыяграфіі тэзіс аб значнай перавазе сіл агрэсара на рашаючых напрамках свайго наступлення (с. 78). Варта заўважыць, што ў найноўшым расійскім даведачным выданні «Вялікая Айчынная без грыфу сакрэтнасці» (2010), падрыхтаваным на аснове раней закрытых для друку архіўных дакументаў, канстатуецца, што сумарныя (агульныя) суадносіны сіл і сродкаў Германіі і яе саюзнікаў і СССР складалі 1,19 да 1, а вось сухапутных войскаў – 1 да 1,12 адпаведна [7, с. 25–26]. Ды і сам М. Ю. Мягкоў у адным з папярэдніх выданняў прытрымліваўся думкі,

што па агульнай колькасці танкаў і самалётаў перавага была на савецкім баку [8, с. 53]. Здзіўляе і факт выкарыстання фактычна ў якасці адзінай замежнай гістарыяграфічнай крыніцы працы амерыканскага ваеннага гісторыка Д. Гланца. Пры ўсёй павазе да яго работ, дзе актыўна выкарыстаны і савецкія, і нямецкія крыніцы (без высвятлення ступені іх навуковай верагоднасці), адзначым, што пры вывучэнні падзей на германа-савецкім фронце перавагу ў даследаванні неабходна надаваць нямецкаму 10-томнаму выданню «Германскі рэйх і Другая сусветная вайна» [9, S. 454, 474]. Аднак М. Ю. Мягкоў яго не выкарыстоўваў, што асабліва заўважна ў дэталях. Так, апісваючы сілы трох нямецкіх груп, што наносілі ўдар па заходніх рубяжах СССР (с. 79), ён канстатуе, што «танкавая дывізія ў 1941 г. па штаце складалася з двух-трох танкавых батальёнаў» (заўважым, што спасылка пры гэтым зроблена на Д. Гланца). На самой жа справе размова тут павінна ісці пра танкавыя палкі, асновай якіх у сваю чаргу з’яўляліся танкавыя батальёны [10, с. 15–19].

Характарызуючы баявыя дзеянні Заходняй Асобнай ваеннай акругі, даследчык выказвае спрэчную думку аб тым, што большасць савецкіх танкавых і механізаваных дывізій, аб’яднаных у складзе 20 механізаваных карпусоў, з’яўляліся баяздольнымі адзінкамі толькі на паперы (с. 81). Аднак гэты тэзіс не пацверджаны дакументальна. Больш за тое, контрудары, нанесеныя ў першыя дні вайны механізаванымі карпусамі ў Беларусі (раёны Гродна, Лепеля, Жлобіна і Рагачова) і Украіне (у раёне Роўна, Луцка, Брадоў, Дубна), фактычна абвяргаюць прыведзенае меркаванне [11; 12].

Далей у матэрыяле расійскага гісторыка адзначаецца, што, нягледзячы на значныя лічбы, савецкія войскі «маральна і інстытуцыйна не былі падрыхтаваны да той вайны, якую збіраўся весці Гітлер» (с. 81). Мы цалкам пагаджаемся з такой ацэнкай, але заўважым, што пры разглядзе прычын катастрафічнай сітуацыі на Заходнім фронце ў першыя дні вайны аўтару неабходна было ўзгадаць, што аб характары будучай вайны Германіі супраць СССР і напрамку галоўнага ўдару ў перадваенны час выказаўся М. М. Тухачэўскі. Яшчэ ў 1937 г. у ходзе судовага працэсу Спецыяльнай судовай прысутнасці Вярхоўнага суда СССР ён выклаў свае думкі ў «Плане паражэння», дзе вызначыў галоўную стратэгічную прастору будучага ўдару войск Германіі вышэй за Прыпяцкія балоты, г.зн. на тэрыторыі Заходняй Асобнай ваеннай акругі [13]. Адзначым, што М. Ю. Мягкоў толькі часткова закранае гэты аспект і канстатуе факт недаацэнкі падобных папярэджанняў у Генштабе і наркамаце абароны СССР.

Пры фрагментарным разглядзе ваенных падзей у паласе абароны Заходняй Асобнай ваеннай акругі аўтар прыходзіць да высновы, што на гэтым напрамку прыгранічных баёў летам 1941 г. там склалася асабліва цяжкае становішча. Акружэнне асноўных сіл фронту стала адной з першых найбуйнейшых трагедый, якая прывяла да «гібелі ці ўзяцця ў палон больш чым 300 тыс. чалавек з групоўкі генерала арміі Паўлава» (с. 83). Зварот да нямецкіх дакументаў паказвае іншыя маштабы трагедыі – на тэрыторыі Беларусі за гады вайны загінуў кожны трэці чырвонаармеец, які быў узяты

ў палон войскамі групы армій «Цэнтр», і кожны пяты з усіх савецкіх ваеннапалонных. Паводле нямецкіх дакументаў, да канца жніўня 1941 г. на цэнтральным напрамку наступлення вермахта былі ўзяты ў палон 784 тыс. чырвонаармейцаў [14, с. 99].

Завяршаючы разгляд баявых падзей Заходняй Асобнай ваеннай акругі, М. Ю. Мягкоў ставіць у фокус увагі чытача адну з галоўных бітваў – Смаленскую, якой надае вырашальнае значэнне ў плане зрыву нямецкага бліцкрыгу. У матэрыяле раскрываецца яе ход: яна адбывалася на галоўным, (маскоўскім) напрамку наступлення вермахта ў ліпені – верасні 1941 г. Пры гэтым аўтар адзначае, што насамрэч тэатр баявых дзеянняў быў больш шырокім і пакрываў вялікую прастору, у тым ліку Беларусь. Аднак характар і маштабы баёў на беларускай тэрыторыі ў матэрыяле паказаны толькі схематычна, не выяўлена іх сапраўднае ваенна-стратэгічнае значэнне, паколькі баявыя падзеі на тэрыторыі Беларусі сталі галоўнай прычынай таго, што група армій «Цэнтр» была вымушана перайсці да абароны і адкласці на два месяцы наступленне на маскоўскім напрамку. На наш погляд, у ходзе контрнаступлення Заходняга і Цэнтральнага франтоў у канцы ліпеня і пачатку жніўня 1941 г. вызначыліся два ачагі барацьбы – адзін у раёне Смаленска і Ельні, а другі – на рацэ Сож і ў міжрэччы Дняпра і Бярэзіны. Як вынікае з «Меркаванняў і распараджэнняў фюрэра» ад 28 ліпеня 1941 г., «важнейшай задачай з’яўляецца ліквідацыя пагрозы на фланзе групы армій “Цэнтр” шляхам разгрому варожай групоўкі, якая знаходзіцца ў раёне Гомеля і на поўнач ад яго» [15, с. 294]. Такім чынам, сілы Заходняга фронту, якія абаранялі бярэзінска-дняпроўска-сожскія рубяжы, пры гэтым паспяхова контратакуючы праціўніка на бабруйскім напрамку, пераўтварылі з сярэдзіны ліпеня Гомель і раён міжрэчча Дняпра і Бярэзіны ў ключавую праблему баявога стрымлівання вермахта на маскоўскім напрамку. Гэта галоўным чынам і прывяло да падпісання Гітлерам дырэктывы № 34 ад 30 ліпеня 1941 г., згодна з якой самая моцная групоўка вермахта – група армій «Цэнтр» – павінна была спыніць наступленне і перайсці да абароны [15, с. 280].

Тады як, на думку М. Ю. Мягкова, галоўнай прычынай прыняцця Гітлерам дырэктывы № 34 ад 30 ліпеня 1941 г. былі абарончыя баі за Смаленск, з нямецкіх дакументаў бачна, што гэта не зусім так. Таксама не вельмі зразумелым будзе для чытача той факт, што расійскі аўтар пры характарыстыцы асноўных падзей ліпеня 1941 г. толькі згадвае «акружаны Магілёў» (с. 108), не паказваючы яго сапраўднага значэння ў абароне дняпроўскага рубяжа. Хаця ў аўтара не знайшлося месца для адлюстравання ўнікальнай аперацыі на Дняпры, якая фактычна праводзілася ва ўмовах акружэння і без камандавання зверху, яе нельга замоўчваць нават па той прычыне, што менавіта тут германскім сілам прыходзілася штурмаваць «бастыён на Дняпры», «крэпасць Магілёў» і забяспечваць вырашэнне аператыўных баявых задач у ходзе «Магілёўскай бітвы» [16].

Такім чынам, расійскі даследчык, праводзячы аналіз баявых падзей Заходняга фронту на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г., прапануе чытачу навуковыя ацэнкі, у дачыненні да якіх склаўся пэўны кансенсус у сучаснай расійскай ваеннай гістарыяграфіі. Варта адзначыць, што аўтар выкарыстаў даволі абмежаваную базу крыніц, сярод якіх цалкам адсутнічаюць дакументы

з Федэральнага ваеннага архіва ў Фрайбургу, найноўшыя выданні нямецкіх гісторыкаў, а таксама навуковая літаратура беларускіх аўтараў [17; 18]. На наш погляд, на цяперашні час нельга праводзіць гістарычнае даследаванне аб баях летам 1941 г. паміж Чырвонай арміяй і германскім вермахтам без уліку «нямецкага боку».

У частцы II «Беларусь» беларускія прафесійныя ваенныя гісторыкі А. М. Літвін і І. Ю. Варанкова раскрываюць характар бітвы за Беларусь летам 1941 года (с. 241–536) у рамках адметнай навуковай канцэпцыі. На фоне паказу расійскімі гісторыкамі «катастрофы лета 1941 года» беларускія даследчыкі мэтанакіравана адлюстроўваюць тыя падзеі ў кантэксце арыгінальнага тэзіса «бітвы за Беларусь летам 1941 года». Чытачу не толькі варта звярнуць на яго асаблівую ўвагу, але і асэнсаваць сутнасць гэтай назвы. Паколькі, як адзначаюць аўтары матэрыялу, пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны, адной з галоўных частак якога былі абарончыя баі войскаў Заходняга фронту на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г., фактычна стаў самым «суровым выпрабаваннем на трываласць савецкай дзяржавы і яе Узброеных сіл» (с. 400). На думку аўтараў, найноўшая гістарыяграфія (расійская, беларуская, украінская) пачатковага перыяду вайны даволі часта ўтрымлівае процілеглыя падыходы, меркаванні і ацэнкі (с. 242). Таму асабліва важна, што аўтары, зыходзячы з гэтага, імкнуцца аспрэчыць канцэпцыю абарончых баёў, якая была характэрна для гістарыяграфіі савецкіх часоў, і вядуць, такім чынам, сучасны навуковы дыскурс на полі з постсавецкімі гістарычнымі ацэнкамі.

Звернем увагу чытача на тое, што ў другім раздзеле аўтары з выкарыстаннем шматлікіх фактаў раскрываюць трагічныя і гераічныя падзеі пачатку вайны, якія мелі месца на беларускай зямлі летам 1941 г., глыбока асэнсоўваюць прычыны паражэння савецкіх войскаў у гэты перыяд, а таксама паказваюць ролю дзяржаўных і ваенных структур у арганізацыі адпору ворагу. Калі ў расійскім матэрыяле гэта была расійская ілюстраваная энцыклапедыя «Вялікая Айчынная вайна 1941–1945 гадоў», дык беларускія гісторыкі звярнуліся да фундаментальнай 10-томнай нямецкамоўнай працы «Германскі рэйх і Другая сусветная вайна». Пры гэтым аўтары прыходзяць да новай навуковай высновы аб тым, што перавагу нямецкіх войск неабходна шукаць не сярод колькасных паказчыкаў, як гэта рабілася да гэтай пары, а сярод якасных у самым шырокім сэнсе (с. 309). Такі падыход даў аўтарам магчымасць паказаць рэальныя колькасныя суадносіны сілаў вермахта і люфтвафэ і вайсковых часцей Заходняга фронту на галоўным напрамку наступлення, а таксама намаляваць агульную карціну геаграфічнага размяшчэння канкрэтных часцей Чырвонай арміі на заходнім рубяжы

Між тым звернем увагу на некаторыя істотныя моманты. Так, знаёмячы чытача з асноўнымі вайсковымі сіламі групы армій «Цэнтр», аўтары пішуць, што на правым нямецкім флангу (не левым савецкім) гэты ўдар забяспечвала 2-я танкавая група Г. Гудэрыяна ў складзе двух танкавых карпусоў (24 і 47-га) з прыдадзенай ім авіягрупай бамбардзіроўшчыкаў бліжняга дзеяння і зенітна-артылерыйскім палком люфтвафе «Герман Герынг» (с. 305). Самым нечаканым у гэтым з’яўляецца тое, што аўтары прыводзяць

спасылку на ўспаміны камандуючага 2-й танкавай групай генерал-палкоўніка Г. Гудэрыяна. Паводле ж дзённіка баявых дзеянняў, які з'яўляецца зыходнай крыніцай для вызначэння такой прыналежнасці, па стане на 21 чэрвеня 1941 г. у склад 2-й танкавай групы ўваходзілі разам з 24-м (у складзе 255 і 267-й пяхотных, 1-й кавалерыйскай, 3 і 4-й танкавых і 10-й матарызаванай дывізій), 47-м (у складзе 17 і 18-й танкавых, 167-й пяхотнай і 29-й матарызаванай дывізій) і 46-ы танкавы корпус (у складзе 10-й танкавай дывізіі, дывізіі СС «Рэйх» і палка «Вялікая Германія») [19, Bl. 13]. Як бачна, без уліку «нямецкага погляду», адбудаванага толькі на мемуарнай літаратуры, а не на дакументальных крыніцах, на цяперашні час немагчыма аднавіць рэальную карціну баявых падзей летам 1941 г.

З самага пачатку разгляду баявых падзей Заходняга фронту аўтары спрабуюць аспрэчыць традыцыйныя погляды на прычыны паражэння Чырвонай армі і ў пачатковы перыяд вайны і віну ў гэтым камандуючага фронтам Паўлава і яго бліжэйшага атачэння. Гісторыкі звяртаюцца да новых дакументаў, сярод якіх – малавядомыя матэрыялы судовага следства па абвінавачванні Д. Р. Паўлава, В. Я. Клімаўскіх, А. Ц. Грыгор'ева і А. А. Карабкова, пратаколы закрытага пасяджэння па іх справе, а таксама малавядомы дакумент – тлумачэнне, дадзенае ў 1956 г. былым начальнікам аператыўнага аддзела штаба Заходняга фронту генерал-маёрам Б. Фаміным намесніку начальніка Генеральнага штаба Савецкай арміі па ваенна-навуковай рабоце В. В. Курасову [20, с. 134–136]. Паводле новых звестак Паўлаў ведаў аб падрыхтоўцы немцамі нечаканага нападзення і звяртаўся да вышэйшага ваеннага камандавання за дазволам заняць палявыя ўмацаванні паўздоўж граніцы. Аднак Народны камісар абароны «не дазволіў заняць палявых умацаванняў, паколькі гэты можа выклікаць правакацыю сярод немцаў» [20, с. 135]. Аўтары пераканаўча паказваюць, што, насамрэч, камандаванне Заходняга фронту, нягледзячы на ўмяшанне зверху, аб'ектыўную адарванасць ад кіравання войскамі, прыкладала ўсе свае намаганні для таго, каб наладзіць упраўленне войскамі і збіць тэмпы наступлення праціўніка.

Але ж комплексны падыход да вывучэння баявых дзеянняў Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. запатрабаваў ад аўтараў прыцягнення да даследавання не толькі значнай колькасці новых даных чыста гістарычнага характару, але і асэнсаваных на цяперашні час вынікаў малавядомых ваенных старонак у беларускай гістарыяграфіі. Аднак аўтары часам выкарыстоўваюць традыцыйныя звесткі, абвергнутыя ў найноўшай беларускай гістарыяграфіі.

Так, паказваючы гісторыю абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г., аўтары сцвярджаюць, што ў ходзе барацьбы «даўжэй усіх трымалася цытадэль» (Цытадэль. – *С. Н.*) (с. 314). Калі выкарыстоўваць уведзеныя ў навуковы зварот новыя нямецкія звесткі, то апошнім, найбольш трывалым, ачагом абароны амаль да канца месяца заставаўся Усходні форт, дзе ўпартую абарону арганізаваў камандзір 44-га стралковага палка маёр П. М. Гаўрылаў.

Не зусім зразумелым для чытача будзе і такое сцвярджэнне, што легендарны абаронца быў узяты ў нямецкі палон 27 ліпеня 1941 г. (с. 314). Але чаму П. М. Гаўрылаў у сваіх успамінах, якія выйшлі ў сярэдзіне 1970-х гг., піша пра сваю 32-дзённую эпапею абаронцы крэпасці на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання [21]? Таксама наколькі адэкватнай з'яўляецца выснова, прыведзеная аўтарамі ў кнізе са спасылкай на публікацыю канца 1970-х гадоў: пасля стварэння адзінага штаба абароны 24 ліпеня 1941 г. было прынята рашэнне прарывацца з акружэння (с. 314)? Не кожны чытач дасведчаны ў дакладнай храналогіі падзей абароны Брэсцкай крэпасці. Таму такая падача паказвае, што стварэнне штаба абароны Брэсцкай крэпасці неабходна разглядаць як самы важны момант той гераічнай эпапеі, як сведчанне таго, што нават у вельмі цяжкіх умовах абаронцы імкнуліся арганізавацца і працягваць барацьбу. Лепш за ўсё гэту думку пацвярджае пасыл з загада № 1 ад 24 ліпеня 1941 г. «Узнікшая абстаноўка ў крэпасці патрабуе стварэння адзінага кіраўніцтва і арганізаванага баявога дзеяння для далейшай барацьбы з праціўнікам» [22, с. 209]. Чытачу неабходна таксама звярнуць увагу на стыль баявога загада, у якім абаронцы ўжываюць нарматыўную, а не ідэалагічную, лексіку ў дачыненні да дэфініцыі «праціўнік».

Зусім незразумелым выглядае і такі пасаж: Усходні форт, які з першых гадзін вайны стаў ачагом жорсткага супраціўлення, 30 чэрвеня быў захоплены штурмам толькі пасля мінамётнага і артылерыйскага абстрэлу (с. 314). Паводле ж нямецкага дакумента, які вядомы ў беларускай навуковай гістарыяграфіі, інтэнсіўны артабстрэл Усходняга форту танкамі і штурмавымі гарматамі, нягледзячы на тое, што былі разбураны асобныя мураваныя сцены, атрымаўся безвыніковым. Не дала значнага выніку і ранішняя бамбардзіроўка форту 500-кілаграмовымі бомбамі. Толькі тады, калі ў другой палове дня авіяцыя паўтарыла налёт з выкарыстаннем такіх жа бомб, а потым і весам 1 800 кг, форт быў цалкам захоплены [23, с. 43].

Разглядаючы маштабы страт, панесеных Заходнім фронтам у гэтых прыгранічных баях, аўтары прыводзяць шматлікія лічбы. Так, напрыклад, да зыходу баёў пад Гродна была цалкам разгромлена матэрыяльная часць 11-га механізаванага корпуса (з 243 танкаў засталося толькі 50 (с. 332)). Між тым, аўтары пакідаюць адкрытым адно з галоўных пытанняў – аб людскіх стратах, якія з савецкай гістарыяграфіі вядомы як «беззваротныя страты». Аўтары тлумачаюць сутнасць гэтай гістарычнай дэфініцыі такім чынам: яна ўключала тых, хто быў забіты ці памёр ад ранення, а таксама тых, хто патрапіў у палон (с. 398). Аднак далей гэтага па незразумелых прычынах не ідуць, пакідаючы для чытача толькі голыя лічбы «беззваротных страт», панесеных часцямі Чырвонай арміі ў прыгранічных баях на тэрыторыі Беларусі. Кажучы пра прыгранічныя баі, якія адбываліся на Берасцейшчыне і Гродзеншчыне ў пачатку вайны, важна памятаць, што большасць чырвонаармейцаў не загінулі, а патрапілі ў нямецкі палон. Так, з загада камандуючага групай армій «Цэнтр» ад 7 ліпеня 1941 г. вынікае, што на той час былі паспяхова завершаны баі ў раёне Беластока і Мінска. У выніку ў

нямецкім палоне апынуліся 287 704 чырвонаармейцы [24, Bl. 159]. Аднак чытач на фоне дакладных звестак пра згубленую тэхніку так і не даведаецца аб рэальных маштабах людскіх страт (з улікам савецкіх ваеннапалонных), якія сталі фактам прыгранічных баёў Чырвонай арміі ў Беларусі летам 1941 г.

Між тым цікавай для чытача будзе і тая частка матэрыялаў, у якіх даецца апісанне баявых падзей, што адбываліся на мінскім, слуцкім і полацкім напрамках абароны, дзе ў савецкі час былі створаны абарончыя ўмацаванні, вядомыя з айчыннай гістарыяграфіі пад назвай УРаў. З матэрыялаў кнігі бачна, што, паколькі шматлікія фартыфікацыйныя збудаванні не былі занятымі ні часцямі Чырвонай арміі, ні апалчэнцамі, на некаторых участках прасоўванне нямецкіх войск не сустракала нават нязначнага супраціўлення (с. 356). Аўтары прыводзяць даволі падрабязны матэрыял аб абарончых баях, якія вялі часці Чырвонай арміі ў ходзе абароны Мінска. На аснове нямецкага дакумента аўтары падрабязна распавядаюць пра баі, якія мелі месца ў раёне Астрашыцкага Гарадка (с. 360). У працы даецца даволі падрабязнае апісанне горада і падзей, якія адбыліся пасля яго захопу ў другой палове 28 ліпеня 1941 г. Раскрываецца карціна трагедыі, якую перанесла сталіца ў ходзе неаднаразовай нямецкай бамбардзіроўкі. Са спасылкай на нямецкага гісторыка К. Герлаха практычна ўпершыню згадваецца аб першых і значных людскіх стратах. Важна, што пры гэтым аўтары аспрэчваюць традыцыйную лічбу, якая праходзіла ў матэрыялах Мінскай абласной камісіі па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Нагадаем чытачу, што размова вялася пра 186 чалавек, якія загінулі ў горадзе да пачатку яго захопу. На гэты момант аўтары ўводзяць лічбу прыкладна каля 1 тысячы чалавек (с. 363). Кажучы пра колькасць, аўтары ўлічваюць тых, хто да вайны пражываў у сталіцы, выкарыстоўваючы ў якасці адліку лічбу ў больш за 250 тысяч. Аднак гэта не зусім дакладна, паколькі ў самым пачатку 1941 г. у горадзе пражывала каля 300 тысяч чалавек, пра што паведамлялася ў рэспубліканскім друку ў самым пачатку года.

Контрудары Чырвонай арміі на Віцебшчыне і Гомельшчыне ў пачатку і сярэдзіне ліпеня 1941 г. аўтары разглядаюць даволі дэталёва. У першым выпадку рэканструкцыя тых падзей вядзецца галоўным чынам на аснове ўспамінаў начальніка штаба 13-й арміі генерала С. Іванова. Паводле яго ацэнак, ударны танкавы «кулак» двух карпусоў складалі каля 1 400 баяздольных машын, тады як іх агульная колькасць складала 1639 танкаў, з іх на ўліку 5-га мехкорпуса значылася 924, а 7-га – 715 танкаў (с. 376). Аднак паводле архіўных дакументаў, уведзеных у апошні час расійскім гісторыкам А. В. Ісаевым, колькасць танкавага парка 7-га мехкорпуса па стану на 6.07.1941 г. складала толькі 507 баявых адзінак, тады як 5-га – 838 танкаў [25, с. 334, 347].

Аўтары на шматлікіх прыкладах паказваюць драматычныя вынікі «бяссэнсавых баёў» гэтых карпусоў, якія былі фактычна разгромлены, страціўшы пры гэтым амаль 2/3 парка баявых машын, або 832 танкі (с. 378), пры гэтым толькі трэцюю частку на полі бою ў ходзе танкавых баёў ці дзейнасці процітанкавай артылерыі фашыстаў [12, с. 23]. У гэтай сувязі звернемся да ацэнак, якія дае непасрэдны ўдзельнік тых баёў, начальнік

штаба 5-га механізаванага корпуса Герой Савецкага Саюза В. В. Буткоў. Ён сцвярджае, што агульныя страты яго корпуса ў людзях і тэхніцы у ходзе лепельскага контрудару склалі каля 60 % [26, с. 65].

Апроч таго, чытачу не будзе да канца зразумелай сітуацыя, якая адлюстравана ў матэрыяле, дзе агульная карціна тых драматычных падзей паказана выключна праз баявыя дзеянні з савецкага боку. З матэрыялу атрымліваецца, што супраць двух паўнавартасных мехкарпусоў вялі бой толькі дзве нямецкія танкавыя дывізіі – 7-я і 17-я. Нагадаем, што першая з іх належала да 3-й, а другая – да 2-й танкавай групы. Пры гэтым важна ведаць, што ў баях пад Сянно ўдзельнічала сіламі ў 80 танкаў толькі адна баявая група 17-й нямецкай танкавай дывізіі [12, с. 21]. Як сведчыць гэты прыклад, аднабаковы паказ баявых падзей не дае непрафесійнаму чытачу магчымасці самастойна аднавіць карціну тых падзей, убачыць іх галоўныя этапы, зразумець ход бою і яго вынікі.

Як паказваюць аўтары, асабліва жорсткія баі вяліся Заходнім фронтам на дняпроўскім рубяжы ў раёне Оршы, Шклова, Магілёва, Жлобіна і Рагачова. Асаблівае месца ў матэрыяле займае абарона «Мадрыда на Дняпры» (с. 387), якая фактычна пачалася 3 ліпеня 1941 г. і доўжылася да 26 ліпеня. На думку аўтараў, абарона Магілёва, якую разам з рэгулярнымі часцямі вяло і магілёўскае апалчэнне, заслужыла эпітэта «гераічная». Утрымліваючы горад да апошняй магчымасці, часці генерала Раманава сумелі скаваць буйную групоўку праціўніка і нанесці ёй адчувальныя страты, вядучы трохтыднёвую бітву (с. 388). Адразу ж адзначым, што ўвядзенне дэфініцыі «бітва» у дачыненні да гісторыі абароны Магілёва мае асабліва важнае значэнне ў беларускай ваеннай гістарыяграфіі. Між тым падумаем, наколькі адпавядае гістарычнай рэчаіснасці такое сцвярджэнне: «спробы нямецкіх войскаў зламаць абарону працягваліся і ў наступныя дні, а адна з самых сур'ёзных была зроблена імі 11 ліпеня» (с. 386). Асабліва цяжкай склалася абстаноўка ў раёне сёл Буйнічы і Цішоўка, дзе трымаў абарону 388-ы стралковы полк і народнае апалчэнне (с. 387). Аднак гэту дату не пацвярджаюць ні аператыўныя зводкі штаба 172-й стралковай дывізіі [27, с. 195], ні нямецкае данясенне аб баях на Буйніцкім полі 12 ліпеня 1941 г. [28, с. 12–19]. Не зусім дакладным з'яўляецца і наступны выраз аб тым, што пасля спробы прарыву «Раманаў арганізаваў на тэрыторыі вобласці партызанскі атрад, але быў выданы здраднікам і публічна пакараны» (с. 388). Што ў якасці доказаў стаіць за гэтым тэзісам, калі мець на ўвазе дакументальна пацверджаны факт, што з восені 1941 г. генерал Раманаў апынуўся сярод вязняў аднаго з спецыяльных лагераў «Афлаг XIII С» (побач з баварскім горадам Хамельбург), у якім утрымліваліся савецкія палонныя афіцэры, у тым ліку: генерал Раманаў, маёр Гаўрылаў, капітан Зубачоў і іншыя. Лёс першага з іх трагічна абарваўся 3 снежня 1941 г., калі легендарны абаронца памёр ад ранення, атрыманага ў час выхаду з акружэння пад Магілёвам [29, с. 62].

Паказваючы баявыя дзеянні пад Рагачовам і Жлобінам, аўтары падрабязна знаёмяць чытача з контрударам 21-й арміі, перад якой ставілася задача па адцягванні на сябе сіл праціўніка з заходняга напрамку. Яна

13 ліпеня злучэннямі 63-га стралковага корпуса генерал-маёра Л. Р. Пятроўскага пачала паспяховае наступленне ў напрамку названых гарадоў. Аўтары прыходзяць да высновы, што гэта быў бясспрэчны поспех, магчыма, першы за ўвесь пачатковы перыяд вайны. Пастаўленая задача была не толькі выканана, а нават перавыканана (с. 393). Між тым, на наш погляд, баявыя дзеянні Заходняга і Цэнтральнага франтоў на тэрыторыі Гомельшчыны мелі не столькі аператыўнае, колькі стратэгічнае значэнне. Чарговая дырэктыва за нумарам 34 ад 30 ліпеня 1941 г. прынцыпова змяняе стратэгічнае становішча для ўсёй групы армій «Цэнтр», якая, паводле дырэктыўных распараджэнняў самога Гітлера, спыняла наступленне на Маскву і пераходзіла да абароны. У гэтым і заключалася значэнне баявых дзеянняў Чырвонай арміі за Беларусь летам 1941 г.

Падсумоўваючы факты, аўтары прыходзяць да высновы, што ў 1941 г. Чырвоная арміі на тэрыторыі БССР пацярпела адно з самых трагічных і самых жахлівых паражэнняў, якія вядомы ў сусветнай гісторыі (с. 397). Дзеля пацвярджэння пададзены лічбы агульных страт Заходняга фронту. Са спасылкай на расійскую гістарыяграфію прыводзіцца тэзіс, што толькі за першыя 18 дзён вайны, у ходзе якіх мела месца так званая Беларуская стратэгічная абарончая аперацыя, з 625 000 было страчана 417 729 чалавек, з якіх 341 012 страт з'яўляюцца беззваротнымі (с. 398). У гэтай сувязі ў чытача ўзнікае пытанне аб тым, якімі ж лічбамі павінен вымярацца маштаб трагедыі Беларусі, бітва за якую працягвалася фактычна да канца жніўня, а не скончылася 9 ліпеня разам з завяршэннем абарончых баёў. Паводле дакументаў вермахта аб уліку савецкіх ваеннапалонных групай армій «Цэнтр» да канца жніўня 1941 г. былі ўзяты ў палон 784 тысячы чырвонаармейцаў (з якіх на тэрыторыі БССР у палон трапілі 436 тысяч, або 2/3 ад баявога складу фронту на момант пачатку баявых дзеянняў у Беларусі летам 1941 г.) [29, с. 99].

У заключэнні нам падаецца важнай думка аўтараў аб тым, «што палітычнае і ваеннае кіраўніцтва СССР не здолелі прыняць адэкватныя рэальнай сітуацыі рашэнні, што з'яўляецца вялікай палітычнай і стратэгічнай памылкай, якая мяжуе са злачынствам перад уласным народам» (с. 398).

Частка III «Украіна» (с. 537–713) складаецца з 11 самастойных раздзелаў, адзін з якіх прысвечаны «Ваенным дзеянням на тэрыторыі Украіны летам 1941 г.» (с. 552–585). Мы лічым, што яго напісаў ваенны гісторык У. В. Грыцюк [30, с. 208–302]. Украінскі аўтар прапануе чытачу больш фрагментарны паказ баявых дзеянняў пачатковага перыяду (пашыраны варыянт якіх быў годам раней апублікаваны ў акадэмічнай працы), раскрываючы розныя аспекты гісторыі напярэдадні і ў пачатку вайны, а таксама асвятляючы баявыя дзеянні Чырвонай арміі ва Украіне летам 1941 г.

Пачынаючы разгляд ваенных падзей на тэрыторыі Украіны, даследчык зыходзіць з таго факта, што гітлераўскае камандаванне не лічыла паўднёвы напрамак галоўным (с. 554). Варта адзначыць, што ў выданні параўнаны баявыя падзеі на Украіне і Беларусі. Гэта надае матэрыялу асаблівае гучанне. Украінскі гісторык пастаянна звяртаецца да гэтага прыёму, каб даць чытачу магчымасць убачыць, наколькі былі падрыхтаванымі войскі

Паўднёва-Заходняга і Паўднёвага франтоў да выканання баявых задач, звязаных з абаронай заходніх рубяжоў СССР летам 1941 г. Хоць У. В. Грыцюк і прыходзіць да высновы, што савецкія войскі былі фактычна не гатовыя да вырашэння пастаўленых задач і бітвы ў прыгранічных раёнах былі цалкам прайграны, аднак войскі Паўднёва-Заходняга фронту аказалі найбольш моцнае супраціўленне на ўсім савецка-германскім фронце. Гісторык падкрэслівае, што на тэрыторыі Украіны не было дапушчана акружэнне і не адбылося поўнага разгрому асноўных сіл, як гэта сталася на Заходнім фронце у Беларусі (с. 562). Аўтар сцвярджае, што на паўднёва-заходнім напрамку, у адрозненне ад заходняга, да 10 ліпеня гітлераўцы не здолелі разбіць асноўныя сілы Чырвонай арміі (с. 565). Больш таго, контрудары спынялі праціўніка ці затрымлівалі яго на пэўны час (напрыклад, 25 чэрвеня ў раёне Роўна два корпусы здолелі затрымаць на гэтым напрамку да 7 ліпеня 1941 г.). Між тым наспех падрыхтаваныя і недастаткова арганізаваныя контрудары мелі нізкую эфектыўнасць (с. 362). У ходзе прыгранічных баёў ва Украіне былі беззваротна страчаны больш за 172 тысяч чалавек, трапілі ў палон – каля 70 тысяч, а таксама 4 381 танк, 5 806 гармат і мінамётаў і 1 218 самалётаў (с. 564). Як бачым, пакуль аўтар карыстаецца агульнапрынятымі падыходамі падчас паказу страт асабовага складу. Між тым украінскі гісторык пайшоў значна далей. Ён выдзяляе два асноўных этапы правядзення прыгранічных баёў на Украіне. Першы ахопліваў час з 22 па 30 чэрвеня, калі перад савецкімі войскамі ставіліся задачы разбіць групоўкі праціўніка і перайсці ў наступленне. За часам другога (30 чэрвеня – 9 ліпеня) планавалася абарончая аперацыя і арганізоўваўся адыход войскаў Паўднёва-Заходняга і Паўднёвага франтоў на лінію ўмацаваных раёнаў былой граніцы (с. 565).

Аўтар па невядомых прычынах не згадвае аднаго з самых важных фактаў кульмінацыйнай абарончай бітвы на Украіне – контрудару некалькіх механізаваных карпусоў (8-га, 9-га, 15-га і 19-га) у раёне Луцк – Брады – Дубна, дзе з 26 па 30 чэрвеня 1941 г. адбылася самая вялікая танкавая бітва, калі на ўчастку шырыней 70 км сутыкнуліся амаль 2 тысячы танкаў. Хоць савецкія войскі былі разбітыя, аднак упартыя баі на гэтым напрамку на пэўны час спынілі непрыяцеля, забяспечылі адыход іншых часцей і сталі пачаткам да завяршэння «германскага бліцкрыгу» [31, с. 20, 27]. Неабходна адзначыць, што ўкраінскі аўтар аспрэчвае назву «стратэгічная абаронная аперацыя ў Заходняй Украіне і Бесарабіі», уведзеную ў пасляваенны час назву для азначэння прыгранічных абарончых баёў. На яго думку, называць бітву абарончай аперацыяй не карэктна. Больш дакладным тэрмінам з'яўляецца «бітва» («сражение») (с. 565).

Паказваючы баявыя дзеянні войскаў Паўднёва-Заходняга напрамку на Правабярэжнай Украіне з 10 ліпеня да канца жніўня 1941 г., аўтар прыходзіць да наступнай высновы: у канцы жніўня пасля адыходу войск за Днепр скончылася абарончая аперацыя на Правабярэжнай Украіне. Чырвоная армія вымушана была пакінуць не толькі гэту тэрыторыю, але і страціла тут шмат людзей і тэхнікі. У. В. Грыцюк звяртае ўвагу на тое, што ў пачатку верасня групы арміі «Цэнтр» рушылі на поўдзень (с. 568). На думку гісторыка,

абарона сталіцы Украіны ў 1941 г. стала адной з найбольш трагічных і гераічных старонак вайны. У стратэгічным плане абарончыя баі за Кіеў у канцы лета – пачатку восені 1941 г. адцягнулі значныя сілы вермахта з маскоўскага напрамку (с. 578).

Такім чынам, аналіз трох матэрыялаў паказвае, што расійскія, беларускія і ўкраінскія аўтары выкарысталі розныя падыходы да падачы матэрыялу – ад асобных фрагментаў да стварэння абагульненай карціны баявых дзеянняў Чырвонай арміі летам 1941 г. Асноўная ўвага навукоўцаў была сканцэнтравана на ходзе і выніках прыгранічных баёў, а таксама іх вядзенні на іншых рубяжах абароны на тэрыторыі Беларусі, Расіі і Украіны.

Аналіз новай працы паказвае, што гісторыкі паспяхова пераадольваюць адну з галоўных праблем – вузкасць крыніцазнаўчай базы ў распрацоўцы маладаследаваных пытанняў пачатковага перыяду вайны. Аднак выкарыстанне новых дакументальных крыніц, галоўным чынам савецкага паходжання, пакідае адкрытай задачу навуковай верыфікацыі ўпершыню даследаваных матэрыялаў. Больш таго, ставіць на парадак дня цэлы шэраг іншых крыніцазнаўчых праблем, у тым ліку тэорыі і метадалогіі. Як бачна з трох разгледжаных нарысаў, гісторыкі нават блізкіх акадэмічных устаноў выкарыстоўваюць розныя дэфініцыі, звяртаючыся як да традыцыйных, так і новых тэрмінаў, ключавым з якіх з’яўляецца «Вялікая Айчынная вайна». Калі ў беларускім і расійскім тэкстах такая гістарычная дэфініцыя вызначальная, то ва ўкраінскім афіцыйным навуковым дыскурсе больш важнае значэнне набывае тэрмін «Другая сусветная вайна» [6, с. 540]. І калі ў гэтым выданні такі тэзіс ужываецца больш адэкватна, то ў працы Інстытута гісторыі Украіны НАН Украіны «Україна у Другій світовій війні: погдяд з XXI ст.» (2011) агульнапрынятая дэфініцыя амаль цалкам саступае месца тэрміну «Другая світовая війна» [32]. Выключэннем можна назваць толькі матэрыял В. Грыцюка «Стратэгічныя і франтавыя аперацыя Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Украіны» [30].

Разгляд такога пытання актуальны для сучаснага чытача, калі ў грамадскім дыскурсе вызначылася лінія на супрацьстаянне «вайны дэфініцый». Гэта асабліва важна, паколькі ў шматлікіх матэрыялах часам паўтараюцца даволі тыповыя погляды з савецкай гістарыяграфіі, калі з адной працы ў другую пераходзяць асобныя міфы, не кажучы пра відавочную прысутнасць некаторых ідэалагічных стэрэатыпаў. Агульным недахопам такіх даследаванняў часам з’яўляецца тое, што, не маючы дастатковай колькасці дакументальных крыніц, у тым ліку замежнага паходжання, аўтары спяшаюцца паведаміць чытачам штосьці новае, нават сенсацыйнае, што прыводзіць да новых здагадак і паўтору факталагічных памылак. Альбо працягваюць працаваць на аснове толькі капіравання гістарыяграфічных фактаў і навуковай літаратуры [34, с. 36–42], пакідаючы без увагі важныя найноўшыя замежныя распрацоўкі гэтых пытанняў [35; 36; 37; 38].

Таксама кідаецца ў вочы выкарыстанне гісторыкамі наступных дэфініцый – «фашысцкая Германія» (беларускія, расійскія), «нацысцкая Германія» (расійскія і ўкраінскія), «нямецка-фашысцкія войскі» (расійскія), «гітлераўцы» (беларускія), «нацысцкія акупанты» (украінскія) і інш. Правіль-

нае ўтварэнне гістарычных тэрмінаў у навуковых нарысах вельмі важна не толькі для прафесійных гісторыкаў, але і для шырокай чытацкай аўдыторыі, у першую чаргу моладзі. У кантэксце новых метадалагічных падыходаў, якія вызначаны апошнім часам у гістарычнай навуцы ў Беларусі, Расіі і Украіне, выкарыстанне розных дэфініцый патрабуе далейшага навуковага абгрунтавання неабходнасці існавання новай гістарычнай дэфініцыі (напрыклад, «нацысцкая Германія»), а не дэфініцый, замацаваных у савецкай гістарыяграфіі («нямецка-фашысцкія войскі»). Як вядома, вермахт з'яўляўся адным са структурных элементаў нацысцкай Германіі (гэта значыць былі выключна «германскімі» «германская армія», «германскія войскі», «германскае камандаванне» [39, с. 180–186], а не нямецкімі). На жаль, у кнізе чытач не знойдзе тлумачэння прычын розначытання гэтых дэфініцый і аўтарскіх прапаноў па іх ужыванні ў сучаснай навуковай літаратуры і грамадскім дыскурсе.

Атрымліваецца, што ў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі захоўваюцца савецкія гістарыяграфічныя традыцыі, якія працягваюць аказваць пэўны ўплыў нават на цяперашняга даследчыка. Чытачу самастойна становіцца ўсё больш складана вызначыцца ў стракатай інфармацыйнай прасторы, паколькі ў сучасных навукова-папулярных выданнях і featureнатэматычнай літаратуры, прысвечанай пачатковаму перыяду Вялікай Айчыннай вайны, зараз пануюць тэндэнцыйныя ацэнкі і прапануюцца не зусім навуковыя інтэрпрэтацыі тых гістарычных падзей. І гэта робіцца на фоне таго, што ў апошнія гады для беларускіх даследчыкаў сталі больш адкрытымі новыя дакументальныя крыніцы, у тым ліку замежныя, якія дазваляюць пад іншым вуглом паглядзець на ваенную гісторыю і ўнесці пэўныя праўкі ў гісторыю баявых падзей у Беларусі летам 1941 г.

Рэалізаваны сумесны праект сведчыць таксама пра наступнае. На постсавецкай прасторы праходзяць працэсы не толькі фарміравання нацыянальных школ, але змянення навукова-пазнавальных крытэрыяў ацэнкі ў дачыненні да канкрэтных гістарычных фактаў. Як вынік, з'явіліся розныя ацэнкі некаторых падзей, таксама розніцца стылістыка падачы матэрыялаў, спосабы іх інтэрпрэтацыі. Між тым, як адзначаецца ў выданні, разнастайнасць падыходаў пры вывучэнні праблем і выкладанні поглядаў, асваенне новых дакументальных крыніц, у тым ліку замежнага паходжання, станоўча адбіваюцца на аб'ектыўным асвятленні малавывучаных старонак вайны ўвогуле, у тым ліку і яе трагічнага пачатку [39, с. 239]. Аднак вынік сумеснай працы паказвае, што гісторыкам трох усходнеславянскіх краін пакуль удалося не толькі прадставіць блізкае разуменне агульных падзей, але і сфакусіраваць свае намаганні на іх рэгіянальным адлюстраванні (за выключэннем расійскіх гісторыкаў), паказаць напрамкі цяперашняга руху нацыянальных гістарыяграфій па вывучэнні баявых дзеянняў Чырвонай арміі летам 1941 г., акрэсліць іх галоўныя тэндэнцыі і магчымыя перспектывы. Гэта асабліва важна ў кантэксце новых патрабаванняў, якія перад ваенна-гістарычнай навукай ставіць сучасны этап вывучэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, калі на парадак дня выносяцца пытанні аб неабходнасці ўключэння нацыянальных гістарыяграфій у сусветны гістарыяграфічны працэс [40, с. 17; 41, с. 248].

Дэталёвае знаёмства са зместам новага выдання сведчыць аб тым, што за апошні час у Беларусі, Расіі і Украіне ўзніклі, сфарміраваліся і атрымалі развіццё нацыянальныя школы ваенных гісторыкаў. Вызначальнымі ў даследаванні баявых дзеянняў Чырвонай арміі летам 1941 г. з'яўляюцца новыя падыходы, погляды і ацэнкі, дзякуючы якім стала магчымым больш markdown рознабаковае асвятленне ваеннай гісторыі. Немалаважную ролю ў адыходзе ад агульнай канвы савецкай гістарыяграфіі пачалі адыгрываць гістарычныя веды, атрыманыя ў выніку звароту да нямецкіх дакументаў. Аднак да гэтага часу ў беларускіх даследаваннях пакуль слаба выкарыстоўваюцца дадзеныя «нямецкага боку», хоць найноўшыя даследаванні, распрацаваныя на іх аснове, пераконваюць якраз у тым, што такі падыход адкрывае магчымасці для таго, каб убачыць гістарычныя падзеі з супрацьлеглага боку, без чаго сучасныя працы аб баявых дзеяннях Чырвонай арміі і германскага вермахта летам 1941 г. ужо не могуць выступаць поўнымі, аб'ектыўнымі і актуальнымі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Историки Украины, Беларуси и России выпустили книгу о начале Великой Отечественной войны [Электронны ресурс]. – 2016. – Рэжым доступу : http://videonews.com.ua/news/culture/istoriki-ukrainy-belarusi-i-rossii-vypustili-knigu-o-nachale-velikoy-otechestvennoy-voyny.html. – Дата доступу : 1.04.2016.
2. Указатель статей и материалов, опубликованных в журнале «Новая и новейшая история» за 2011–2015 гг. [Электронны рэсурс]. – 2016. – Рэжым доступу : http://www.modern-current-history.igh.ru/archive. – Дата доступу : 01.04.2016.
3. Содержание рубрики «Критика и библиография» номеров журнала «Российская история» за 2011–2015 гг. [Электронны рэсурс]. – 2016. – Рэжым доступу : http://ruhistory.info/category. – Дата доступу : 1.04.2016.
4. Покажчик рецензій й оглядив в УІЖ за 2012–2015 гг. [Электронны рэсурс]. – 2016. – Рэжым доступу : http://history.org.ua/journal_2012_6/journal_2012_6.pdf– journal_2015_6/journal_2015_6.pdf. – Дата доступу : 12.04. 2016.
5. Змест нумароў БГЧ за 2012–2015 гг. [Электронны рэсурс]. – 2016. – Режим доступа : http://kamunikat.org/bielaruski_histaryczny_czasopis.html. – Дата доступу : 12.04.2016.
6. 1941 год: Страна в огне : в 2 кн. – М. : ОЛМА Медиа Групп, 2011. – Кн. 1: Очерки. – 720 с.
7. Великая Отечественная война без грифа секретности. Книга потерь. Новейшее справочное издание / Г. Ф. Кривошеев [и др.]. – М. : Вече, 2010. – 384 с.
8. *Кульков, Е.* Война 1941–1945. Факты и документы / Е. Кульков, М. Мягков, О. Ржешевский. – М. : РОССПЭН, 2005. – 374 с.
9. Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. In 10 Bd. – Stuttgart: Deutsche Verlags-Anstalt, 1987. – Bd. 4 : Der Angriff auf die Sowjetunion / hrsg. vom Militärgeschichtlichen Forschungsamt. – 1172 S.
10. BA-MA- ß RH 27-3/29: Panzer-Regiment 6. Erfahrungsbericht: Kampf der II./PZ. Regiment 6 bei Mohilew am 12.7.1941 // Беларус. гіст. часоп. – 2007. – № 7. – С. 13–19.

11. *Новікаў, С.* Гомельская бітва 1941 года: спробы рэканструкцыі / С. Новікаў // Беларус. гіст. часоп. – 2012. – № 8. – С. 3–14.
12. *Новікаў, С.* Лепельская аперацыя летам 1941 года: спроба навуковай інтэрпрэтацыі / С. Новікаў // Беларус. гіст. часоп. – 2012. – № 11. – С. 14–24.
13. План поражения // Война и мир Михаила Тухачевского / Ю. З. Кантор. – СПб. : Нестор, 2008. – С. 538–575.
14. *Новікаў, С. Я.* Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С. Я. Новікаў. – Мінск : МДЛУ, 2014. – 300 с.
15. Соображения и распоряжения фюрера от 28 июля 1941 г. // Стратегия Гитлера – путь к катастрофе, 1933–1945 : истор. очерки, док. и материалы: в 4 т. / В. И. Дашичев. – М. : Наука, 2005. – Т. 3 : Банкротство наступательной стратегии в войне против СССР, 1941–1943. – С. 294–296.
16. *Новікаў, С.* Магілёўская бітва 1941 года ў данясеннях вермахта / С. Новікаў // Беларус. гіст. часоп. – 2011. – № 7. – С. 23–34.
17. Оборона Беларуси летом 1941 г. // Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А. А. Коваленя (рук. авт. кол-ва) [и др.]. – Мінск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.
18. Трагическое лето 1941-го // Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память: в 2 кн.– Минск : Беларус. навука, 2010. – Кн. 1. – С. 6–58.
19. Darstellung der Ereignisse am 21.6.1941 (Vortrag) // Федэральны ваенны архіў (далей BA-MA). – RH 21-2/927.
20. Объяснение генерал-майора Б. Фомина, данное в 1956 г. заместителю начальника Генерального штаба Советской Армии по военно-научной работе генералу армии В. В. Курасову // 1941 год: Страна в огне : в 2 кн. – М. : ОЛМА Медиа Групп, 2011. – Кн. 2: Документы и материалы. – С. 134–136.
21. *Гаврилов, П. М.* Сражается крепость / П. М. Гаврилов. – 2-е изд., испр. и доп. – Краснодар : Краснодар. книж. изд-во, 1980. – 138 с.
22. Брестская крепость. Война и мир / авт. концепции и текста А. Суворов. – Брест : Полиграфика, 2010. – 256 с.
23. Данясенні аб ходзе баявых дзеянняў пры ўзяцці Брэст-Літоўска ад 8.07.1941 // Беларус. гіст. часоп. – 2010. – № 6. – С. 39–43.
24. BA-MA. – Darstellung der Ereignisse am 8.7.1941: RH 21-2/927, Bl. 159.
25. *Исаев, А. В.* Неизвестный 1941. Остановленный блицкриг / А. В. Исаев. – М. : Яуза; Эксмо, 2010. – 480 с.
26. *Бутков, В. В.* Контрудар 5-го механизированного корпуса на лепельском направлении (6–11 июля 1941 года) / В. В. Бутков // Воен.-ист. журн. – 1971. – № 9. – С. 47–65.
27. Документы штаба 172-й стрелковой дивизии Красной Армии о боях в районе Могилёва. Июль 1941 г. : Оперсводка № 12 к 2.00 13.7.41. Штадив 172 // Могилёвский поисковый вестн. – Могилёв : Информ. агентство «Могилевские ведомости», 2015. – Вып. 10: 75-летию героической обороны г. Могилёва и Днепровского рубежа посвящается. – С. 195–196.
28. *Новікаў, С.* Бой 2-га батальёна 6-га танкавага палка пад Магілёвам. Адлюстраванне падзей на Буйніцкім полі 12 ліпеня 1941 г. у нямецкіх архіўных матэрыялах / С. Я. Новікаў // Беларус. гіст. часоп. – 2007. – № 7. – С. 12–19.

29. *Новікаў, С. Я.* Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С. Я. Новікаў. – 2-е выд., выпр. і дап. – Смаленск : Універсум, 2015. – 436 с.
30. *Грицюк, В.* Стратэгічні та фронтові операції Великої Вітчизняної війни на теренах України / В. Грицюк // Україна ў Другій світовій війні: погдяд з XXI ст. : іст. нариси : у 2 кн. / ред. кол.: В. А. Смолій (гол. кол.) [і інш.]. – Київ : Наук. думка, 2011. – Кн. 1. – С. 208–302.
31. *Исаев, А. В.* Боевые действия Юго-Западного и Южного фронтов в начале Великой Отечественной войны (22 июня – 9 июля 1941 г.) : автореф. дис … канд. ист. наук / А. В. Исаев. – М., 2012. – 32 с.
32. Україна ў Другій світовій війні: погляд з XXI ст. : іст. нариси : у 2 кн. / ред. кол.: В. А. Смолій (гол. кол.) [і інш.]. – Київ : Наук. думка, 2011. – Кн. 1. – 733 с.
33. *Лысенко, О.* Історіописання Другої світової війни як самастійна субдисципліна / О. Лысенко // Україна ў Другій світовій війні: погдяд з XXI ст. : у 2 кн. / ред. кол.: В. А. Смолій (гол. кол.) [і інш.]. – Київ : Наук. думка, 2011. – Кн. 1. – С. 9–42.
34. *Новікаў, С.* Баявыя дзеянні Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 года ў сучаснай расійскай гістарыяграфіі / С. Новікаў // Беларус. гіст. часоп. – 2015. – № 5. – С. 36–42.
35. *Arnold, K. J.* Die Wehrmacht und die Besatzungspolitik in den besetzten Gebieten der Sowjetunion. Kriegsführung und Radikalisierung um «Unternehmen Barbarossa» / K. J. Arnold. – Berlin : Dunker&Humbolt, 2005. – 479 S.
36. *Hürter, J.* Hitlers Heerführer. Die deutschen Oberbefehlshaber im Krieg gegen die Sowjetunion 1941/42 / J. Hürter. – München : Oldenbourg Verl., 2006. – 719 S.
37. *Pohl, D.* Die Herrschaft der Wehmacht. Deutsche Militärbesatzung und einheimische Bevölkerung in der Sowjetunion 1941–1944 / D. Pohl. – München : Oldenbourg Verl., 2008. – 399 S.
38. *Hartmann, Ch.* Wehrmacht im Ostkrieg. Front und militärisches Hinterland 1941/42 / Ch. Hartmann. – München : Oldenbourg Verl., 2009. – 928 S.
39. Доклад генерал-лейтенанта С. А. Калинина Ваенному совету Западного фронта «Некоторые выводы из опыта первых трех месяцев войны и характер ближнего боя» от 25 сентября 1941 г. // 1941 год: Страна в огне : в 2 кн. Очерки. – М. : ОЛМА Медиа Групп, 2011. – Кн. 2. – С. 180–186.
40. *Кілічэнкаў, А. А.* Пачатак Вялікай Айчыннай вайны: сучасная гістарыяграфія і крыніцазнаўства / А. А. Кілічэнкаў, С. Я. Новікаў // Беларус. гіст. часоп. – 2011. – № 6. – С. 12–17.
41. *Киличенков, А. А.* Заключение / А. А. Киличенков // Преддверие и начало Великой Отечественной войны: проблемы современной историографии и источниковедения : материалы междунар. науч.-практ. конф., Москва, 2 апр. 2011 г. – М. : РГГУ, 2012. – С. 248–250.